# А хто ты і дзе, "жывы" чытач?

## Пра ўстановы, якія не сталі "вёсказахавальнымі" брэндамі

**Перад пачаткам "круглага стала", што прайшоў 9 верасня ў рэдакцыйным інфацэнтры, мы паспрачаліся з дырэктарам Дзяржынскай ЦБС Валянцінай Клімовіч наконт тэрміналогіі, якая вызначае сутнасць чытача. Мы, журналісты, паспрабавалі адстаяць сваё бачанне праблемы і давесці, што ледзь не штотыднёва адшукваем на вясковых абсягах актыўнага чытача. Валянціна Віктараўна, апелюючы да таго, што няма пакуль такой, строга вызначанай і занесенай у параграфы справаздачнасці, ацэнкі чытацкай цікавасці да кнігі, казала нам пра больш дарэчную дакладнасць словазлучэння "жывы чытач". Відавочная шматсэнсоўнасць: калі жывы, дык абавязкова — наяўны чытач, і пры гэтым — ні намёку на магчымыя "мёртвыя душы"... Словам, кожны з нас застаўся пры сваім.**

У рэдакцыі "К" сабраліся мінулым панядзелкам намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Алесь СУША, загадчык навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства НББ Марына ПШЫБЫТКА, дырэктар Гродзенскай абласной навуковай бібліятэкі імя Я.Ф. Карскага Лідзія МАЛЬЦАВА, навуковы сакратар Гомельскай абласной універсальнай бібліятэкі Юрый МАКСІМЕНКА, загадчык аддзела краязнаўчай літаратуры Мінскай абласной бібліятэкі імя А.С. Пушкіна Паліна БУБІНА, дырэктар Дзяржынскай ЦБС Валянціна КЛІМОВІЧ, а рэдакцыйны "корпус" прадставілі журналісты Яўген РАГІН і Кастусь АНТАНОВІЧ.

**Яўген РАГІН:**

— Віншуем з Днём бібліятэк! Дзякуй, што вялікую справу робіце. Ды справа, зразумела, не абыходзіцца без праблем. Пра гэта і хацелася б пагутарыць. І давайце зробім асноўны ўпор на сельскія ўстановы. Абласныя ды раённыя бібліятэкі і базу маюць неблагую, і творчымі праектамі могуць пахваліцца. Вашы ж сельскія калегі такой паспяховасцю вызначаюцца не заўжды. Прынамсі, нашы выезды ў рэгіёны даюць падставы для такога сцвярджэння...

**Валянціна КЛІМОВІЧ:**

— Нашы бібліятэкі ды іх развіццё — люстраны адбітак жыцця грамадства ў цэлым. Мы ж, бібліятэкары, не існуём самі па сабе. Сельская бібліятэка — не выключэнне. Наша рэгіянальная палітыка наступная: бібліятэка будзе існаваць да таго часу, пакуль будзе патрэбная насельніцтву.

**Яўген РАГІН:**

— Напярэдадні "круглага стала", Валянціна Віктараўна, вы сказалі, што крызісу ЦБС не заўважаеце. Вы — праціўнік рэформ у бібліятэчнай справе?

**Валянціна КЛІМОВІЧ:**

— Змяняецца жыццё — змяняемся і мы. Інакш каму мы будзем патрэбны? Так, вялікага крызісу бібліятэчнай справы я не назіраю.

**Яўген РАГІН:**

— А крызіс у чытанні? Няўжо працэсы не ўзаемазвязаныя?

**Валянціна КЛІМОВІЧ:**

— Не пагаджуся з тым, што людзі сталі менш чытаць. Натуральна, праблем шмат, і іх неабходна вырашаць. На штомесячных сустрэчах з калегамі, дзе яны павышаюць кваліфікацыю, заўжды кажу: "Мы павінны даказваць сваю неабходнасць!" У выніку нашы ўстановы пазіцыянуюць сябе як інфармацыйныя, камунікатыўныя, сацыяльныя цэнтры, асяродкі адпачынку па інтарэсах. У сетцы — звыш сарака такіх аб'яднанняў. І да нас ідуць людзі. Задавальваюць чытацкія інтарэсы, шукаюць адказы на самыя розныя пытанні. Ды і мы ідзём у народ.

**Кастусь АНТАНОВІЧ:**

— Цікава, а як часта сельскі бібліятэкар ходзіць да чытача?

**Валянціна КЛІМОВІЧ:**

— Калі інвалід ці пенсіянер прачытаў кнігі, ён звяртаецца да нас па тэлефоне. Мы прыходзім і замяняем літаратуру па яго замове... У Станькаве ёсць дзіцячы прытулак, і бібліятэкар не толькі заносіць сюды кнігі, але і ладзіць гутаркі, іншыя мерапрыемствы. А ў Энергетыках, у стацыянарнай бальніцы, у нас дзейнічае пункт кнігавыдачы...

*(Працяг на стар. 4 — 6.)*

**Старэе вёска — знікаюць актыўныя чытачы. Бібліятэка пераўтвараецца ў пенсіянерскую прызбу. Ці ж гэта не патрэба ў рэформе ЦБС, звязанай з дэмаграфіяй? І чытачы ў горад імкнуцца, і бібліятэкары запалу не маюць...**

# А хто ты і дзе, "жывы" чытач?

(Працяг. Пачатак на стар. 1.)

**Яўген РАГІН:**

— Усё гэта цудоўна, але давайце усё ж агучваць тыя праблемы, што замінаюць развіццю справы.

**Алесь СУША:**

— Пагаджуся, што асаблівага крызісу ў чытанні няма. Яно проста трансфармуецца. Днямі ў Сінгапуры скончыў работу Міжнародны кангрэс бібліятэк і бібліятэчных асацыяцый. Дык вось, там даволі пэўна засведчылі, што цягам бліжэйшых сямі-васьмі гадоў у агульнасусветным маштабе жыхары любога рэгіёна планеты будуць мець сучасныя сродкі доступу да інфармацыі ў віртуальным асяроддзі, найперш — мабільныя прыстасаванні. Праблемы доступу на сёння практычна няма і ў беларускай вёсцы. І нам неабходна працаваць з улікам гэтых тэндэнцый. Задача бліжэйшага часу — выкарыстанне сучасных інфармацыйных тэхналогій у дзейнасці бібліятэк...

**Яўген РАГІН:**

— Даруйце, не магу не перабіць... Давайце апусцімся на вясковую глебу. Нават не ва ўсіх установах нашых аграгарадкоў ёсць камп'ютары... Калі цягам некалькіх камандзіровак мы наведваем сельскія бібліятэкі, усе яны і па выглядзе, і па змесце зліваюцца ў штосьці адзінае, сярэднестатыстычнае і не выклікаюць пачуцця журналісцкай сустрэчы з крэатывам, які можна было б прадэманстраваць рэспубліцы. Натуральна, не ўсе сельскія ўстановы такія. І можна казаць пра розныя бібліятэчныя праекты. Але ж мы абмяркоўваем праблемы і шляхі іх вырашэння... Лічу, Магілёўшчына тут крочыць упэўнена. Мясцовы каледж выпускае бібліятэкараў з клубнай адукацыяй, здольных на рэалізацыю маркетынгавых акцый. У бібліятэках аграгарадкоў вобласці — па некалькі камп'ютараў, ёсць яны і ў сельскіх установах...

**Алесь СУША:**

— Так, камп'ютары мае больш за 80 працэнтаў аграгарадоцкіх бібліятэк. Большасць — з доступам у Інтэрнэт. Да 2015-га праблема павінна быць вырашана цалкам... Калі мы створым нармальную сістэму бібліяграфічнага забеспячэння праз электронныя каталогі, праз базу даных, калі "ўзброім" сельскія ўстановы поўнымі тэкстамі рэцэнзаваных дакументаў, тады зможам сцвярджаць, што вясковыя бібліятэчныя магчымасці не адрозніваюцца ад гарадскіх. Электронны каталог усіх ці асноўных устаноў краіны зменшыць дубліраванне ў працы: пры зводным рэсурсе не трэба апісваць тое, што ўжо апісана.

**Кастусь АНТАНОВІЧ:**

— Але ж інфармацыйная няроўнасць пакуль існуе...

**Алесь СУША:**

— Вось яе і імкнёмся ліквідаваць. Адна справа — паставіць камп'ютар з выхадам у Інтэрнэт, і іншая — адабраць патрэбную інфармацыю з высокім узроўнем даверу.

**Яўген РАГІН:**

— Мы, напэўна, акцэнт робім цяпер на кваліфікацыі бібліятэкара? Ды я зноў пра тое, што ёсць... Існуюць, што прыхоўваць, сельскія бібліятэкі, дзе, па словах работнікаў, за дзень не бывае ніводнага чытача.

**Існуюць, што прыхоўваць, сельскія бібліятэкі, дзе, па словах работнікаў, за дзень не бывае ніводнага чытача. Нават кам'пютары сітуацыю не ратуюць.**

Нават кам'пютары сітуацыю не ратуюць. Пытаемся ў такіх установах: "Як вы ўласную будучыню бачыце?" Адказваюць: "Як у нас ці не ўся вёска збіралася, так і будзе збірацца. Тэлевізар з дому прыносім, гарбату п'ём, пра жыццё гамонім". Пра такія цэнтры сацыяльных стасункаў сёння гаварылася ўжо. І сям-там падобныя ўстановы становяцца вясковымі брэндамі не праз праекты, скіраваныя на папулярызацыю чытання, а праз чалавечую еднасць. У нашых вёсках — усё менш моладзі. Старэе вёска — знікаюць актыўныя чытачы. А бібліятэка пераўтвараецца ў пенсіянерскую прызбу. Ці ж гэта не патрэба ў рэформе ЦБС, звязаная з дэмаграфічнай сітуацыяй? І чытачы ў горад імкнуцца, і бібліятэкары адпаведнага прафесійнага запалу не маюць...

**Пра ўстановы, якія не сталі "вёсказахавальнымі" брэндамі**

**Марына ПШЫБЫТКА:**

— Вось вы кажаце, што ў шэрагу бібліятэк вам нецікава і сумна. А давайце я вам знайду ў такіх установах і цікавае, і нясумнае! Проста, вы кепскае бачыце, а я — добрае...

**Яўген РАГІН:**

— Мы не супраць: будзем разам выязджаць. Але ж паверце, і мы добрае шукаем без стомы, бо асноўная журналісцкая задача — перадавы вопыт папулярызаваць. І ці ж наша віна, што пэўныя бібліятэкары, нас пабачыўшы, і слова сказаць не могуць. Якія яны пасля гэтага маркетолагі, псіхолагі і піяршчыкі сваіх здабыткаў?

**Юрый МАКСІМЕНКА:**

— Безумоўна, кадравая сітуацыя наўпрост уплывае на тое, як будзе развівацца сельская бібліятэка...

**Кастусь АНТАНОВІЧ:**

— Чытач ідзе да начытанага, спрактыкаванага бібліятэкара, які ведае не толькі фонд, але і гісторыю, выбітных людзей краю. А калі ён учора ў іншай сферы працаваў, а сёння — ля кніг, ды яшчэ без перападрыхтоўкі, дык чытачоў у яго ніколі не дадасца. На Ушаччыне ў бібліятэцы імя Васіля Быкава пра народнага пісьменніка мы так нічога цікавага і не пачулі, а вось у Глушы на Бабруйшчыне бібліятэкарка не адпусціла нас, пакуль не выклала погляд на постаць Алеся Адамовіча...

**Яўген РАГІН:**

— Мяркую, справа нават не ў спецыяльнай адукацыі. Галоўнае, каб чалавек слова любіў, мову. Для мяне ідэальны бібліятэкар — што хатні лекар, які ведае "хваробы" кожнага свайго чытача і кожнаму прапаноўвае "лекі". Такіх, як паказвае журналісцкая практыка", — мала. А без "навігатара" непадрыхтаваны чытач проста патанае ў кніжным моры. Вось і атрымліваецца, што актыўным чытачом на сяле называюць таго, хто прыходзіць у бібліятэку раз на месяц.

**Марына ПШЫБЫТКА:**

— Такіх асоб не стае і ў іншых сферах дзейнасці...

**Алесь СУША:**

— Няпрофільныя спецыялісты ёсць. Але далёка не заўжды такія спецыялісты — горшыя за выпускнікоў БДУКіМ ці спецыялізаваных каледжаў. Але ж і іншая сітуацыя бывае: прыязджае новы старшыня СВК і сваю жонку не ў паляводства працаваць накіроўвае, а ў бібліятэку... Існуе праблема і з перападрыхтоўкай ды павышэннем кваліфікацыі бібліятэкараў. У дачыненні да гэтага самы раз казаць пра рэфармаванне бібліятэчнай адукацыі...

**Валянціна КЛІМОВІЧ:**

— Частка нашых бібліятэкараў таксама не мае спецыяльнай адукацыі. Мы іх перападрыхтоўваем, і робім гэта, як падаецца, якасна. Але дзяржава павінна паклапаціцца аб павышэнні заробкаў адукаваных спецыялістаў. У іх вочы гарацы! Але ж кожны жадае, каб яго высілкі былі належным чынам ацэнены. А гэтага няма. І праз два гады адпрацоўкі крэатыўшчыкі знікаюць...

**Яўген РАГІН:**

— А мо мы самі сапсавалі бібліятэкараў непатрабавальнасцю? Як кажуць выкладчыкі, самая пасіўная аўдыторыя пры павышэнні кваліфікацыі — бібліятэчная.

**Лідзія МАЛЬЦАВА:**

— Вось да нас прыехалі чатыры маладыя спецыялісты. Заробак з прэміяй і надбаўкай — крыху больш *за два мільёны рублёў. Трыста тысяч* аддаюць за інтэрнат... Мы адкрылі бібліятэчнае аддзяленне на базе вучылішча мастацтваў, дзе спецыяльную адукацыю можна атрымаць завочна. І літаральна прымушаем учарашніх аграномаў вучыцца. Для сельскіх бібліятэкараў ёсць курсы пры аблвыканкаме... Але я пагаджаюся, усё залежыць ад асобы.

**Яўген РАГІН:**

— Пры адсутнасці той асобы актыўнічаць не выпадае. Сельскія спецыялісты, у параўнанні з, да прыкладу, метадыстамі ЦБС, зарабляюць, наколькі ведаю, крыху больш. Але і там актыўнасць — рэдкасць. Занадта сціплыя бібліятэкары, да піяру сваіх спраў нязвыклыя. Ці непрывучаныя?

**Юрый МАКСІМЕНКА:**

— Ды не, прывучаем. Абласная бібліятэка, як метадычны цэнтр, актыўна дапамагае сельскім у распрацоўцы доўгатэрміновых творчых праектаў. Адзін з іх — стварэнне базы даных "Зніклыя, але не забытыя", прысвечанай бібліятэкам і населеным пунктам, што перасталі існаваць пасля аварыі на ЧАЭС...

**Яўген РАГІН:**

— Дапамажыце мне, калі ласка, высветліць, хто ж ён — асноўны чытач сельскай бібліятэкі.

**Лідзія МАЛЬЦАВА:**

— Школьнік, напэўна.

**Яўген РАГІН:**

— Ды ён жа пад прымусам навучальнай праграмы ледзь не штодня ў бібліятэку бегае.

**Лідзія МАЛЬЦАВА:**

— Не пагаджуся! У нас шмат прыкладаў, хоць бы і на Лідчыне, дзе бібліятэкары згуртавалі вакол сябе школьную чытацкую грамаду. І менавіта гэтая грамада паспрыяла таму, каб у сельскай установе з'явілася сучасная тэхніка. Дзеці для гэтага металалом здавалі...

**Яўген РАГІН:**

— Вось такі досвед і для іншых каштоўны... Але я лічу, што асноўны сельскі чытач на сёння — пенсіянер. Паўтаруся, маладыя вясковыя чытачы ў гарадскія бібліятэкі ходзяць...

**Кастусь АНТАНОВІЧ:**

— А як справы з аптымізацыяй?

**Лідзія МАЛЬЦАВА:**

— На Гродзеншчыне летась закрылі 58 бібліятэк. Сёлета — 15. Аб'яднаны 28 — на базе аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі, 7 — на базе школ... Я супраць таго, каб школы ўтрымлівалі агульныя фонды. Там і камплектавання належнага няма. Перыядычныя выданні выпісаць няма за што. Спадзяюся, вынікі эксперыменту будуць аб'ектыўна ацэнены і інтэграваныя ўстановы вернуцца на баланс нашага аддзела.

**Валянціна КЛІМОВІЧ:**

— Інтэграцыя публічных сельскіх бібліятэк са школьнымі адбылася ў нас летась. Фонды пры гэтым не пагоршыліся. Універсальны фонд школьнай установы зліўся з фондам публічнай. А падручнікамі займаецца школьны спецыяліст. Эканамічныя выгоды — несумненныя...

**Кастусь АНТАНОВІЧ:**

— З якой перыядычнасцю працуюць бібліобусы?

**Лідзія МАЛЬЦАВА:**

— Выезды — раз у месяц.

**Яўген РАГІН:**

— А як зразумець тое, што ў Харашках на Дзятлаўшчыне, дзе мы нядаўна былі, жыхары скардзяцца: бібліобуса год не бачылі?..

**Лідзія МАЛЬЦАВА:**

— Справа ў тым, што старая машына "Газель" зламалася, і цяпер вырашаецца пытанне яе замены.

**Юрый МАКСІМЕНКА:**

— Інфармацыйная роўнасць паміж горадам і сялом будзе дасягнута, падаецца, не толькі выкарыстаннем нестацыянарных форм абслугоўвання. Трэба, каб развівалася віртуальная чытальная зала Нацыяналкі. А доступ да гэтых рэсурсаў маюць абласныя і пэўныя раённыя ўстановы.

**Яўген РАГІН:**

— Падаецца, пакуль віртуальная зала стане сапраўды ўсеагульнай, палова сельскіх бібліятэк спыніць існаванне... На майскім Форуме бібліятэкараў Беларусі дырэктар НББ Раман Матульскі агучыў факты, якія пераконваюць: па шэрагу сусветных паказчыкаў мы хранічна адстаём у развіцці бібліятэчнай справы. А мы з вамі працягваем называць праблемы, але не вельмі выразна ўяўляем, як яны будуць вырашаны.

**Марына ПШЫБЫТКА:**

— Як не ведаем?! Не завершана камп'ютарызацыя, дык яе трэба завяршаць! Частку маладых чытачоў мы і губляем, відаць, з-за таго, што сельскія бібліятэкі пакуль не могуць пахваліцца багаццем электронных носьбітаў... НББ праводзіла даследаванне: якія функцыі бібліятэк найбольш запатрабаваны. У горадзе 15% чытачоў хацелі б у бібліятэчных сценах ладзіць сустрэчы, рабіць творчую справу. На сяле колькасць такіх чытачоў дасягае 40%.

**На Форуме бібліятэкараў Беларусі дырэктар НББ агучыў: па шэрагу сусветных паказчыкаў мы хранічна адстаём у развіцці бібліятэчнай справы. А мы працягваем называць праблемы, але не ўяўляем, як яны вырашацца.**



Юрый Максіменка.



Валянціна Клімовіч.



Лідзія Мальцава.



Паліна Бубіна.



Марына Пшыбытка.



Алесь Суша.

Гаворка — пра стасункі і з чытачамі, і з бібліятэкарам. Таму да скарачэння бібліятэк на сяле варта падыходзіць асцярожна. Але ж і канкрэтныя праекты ў гэтым кірунку — заўжды ўхвальныя ды чаканыя. У адваротным выпадку, людзі застануцца ў вакууме. Я была ў такіх вёсках, дзе сацыяльнага работніка замяняе тэлевізар: уражанне не вельмі станоўчае...

**Яўген РАГІН:**

— Мы згодны: часам бібліятэка — гэта адзіны вясковы брэнд, які аб'ядноўвае грамаду і дае шанц паселішчу на выжыванне.

**Кастусь АНТАНОВІЧ:**

— А як вызначыць эфектыўнасць бібліятэкі, каб яе не закрылі?

**Марына ПШЫБЫТКА:**

— Гэта яшчэ адна праблема. Дзяржаўны ўлік бібліятэчнай дзейнасці засноўваецца на паказчыках 2000 года, што адлюстраваны ў нацыянальным стандарце. На сёння некалькі асноўных паказчыкаў: колькасць чытачоў, кнігавыдача. Ад гэтага і залежыць, ці застанецца бібліятэка ды бібліятэкар.

**Яўген РАГІН:**

— Але гэтыя паказчыкі ў такім выпадку — асноўны стымул для бібліятэчных прыпісак, каб застацца?

**Марына ПШЫБЫТКА:**

— Аб прыпісках нічога не скажу... Мы кажам пра пераход абслугоўвання ў электронным асяроддзі. Аднак у дзяржаўнай статыстыцы на сёння ўлічваецца толькі выдача друкаванага дакумента. Нават у НББ, хоць віртуальных наведвальнікаў у нас ужо больш, чым "жывых"...

(Заканчэнне на стар. 6.)

